Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА
АДЗІНАЙ ГІДРА-МЕТЭАРАЛАГІЧНАЙ СЛУЖБЫ
пры НКЗ БССР

ДЭКАДНЫ БЮЛЕТЭНЬ ГАЛОЎНАГА КІРАЎНІЦТВА І ГІДРАМЕТІНСТЫТУТА

Адрас рэдакцыі: Менск, Шырокая 28. Галоўнае Кіраўніцтва АГМС БССР. Тэл. 24271 і 23280.

№ 18 (131)	1—10 снежня	1933 г.

ЗМЕСТ

З пастановы ЦК КП(б)Б аб мерах палепшання работы гідраметслужбы БССР.

ЦК КП(б)Б лічыць, што работа АГМС не забяспечвае абслугоўвання патрэб народнай гаспадаркі, асабліва сельскай гаспадаркі.

Значная засмечанасць Гідраметслужбы класава-варожымі элементамі, наяўнасць фактаў шкодніцтва ў галіне гідраметэаралогіі, бяздзейнасць нізавых арганізацый АГМС сведчыць аб тым, што кіраўніцтва і партячэйка АГМС не ўлічылі ўрокаў справы Наркамзема.

Улічваючы важнейшае гаспадарчае і абароннае значэнне работы АГМС, ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Абавязаць РК КП(б)Б арганізаваць кіраўніцтва і нагляд за работай метеаралагічных і гідраметрычных станцый.

2. Даручыць т. Мамаеву на працягу двух дэкад праверыць увесь склад работнікаў гідраметслужбы з тым, каб канчаткова ўзмацніць і ачысціць апарат ад сацыяльна-варожых элементаў

4. Для ўзмацнення партыйнай праслойкі гідраметслужбы БССР, Аддзелу кадраў ЦК КП(б)Б накіраваць двух членаў партыі на пасаду начальнікаў сектара сеткі і інспектара па кадрам.

7. Абавязаць дырэктара Белкомунбудтрэста тав. Адзінцова закончыць будаўніцтва Беларускай Геафізічнай Абсерваторыі да 1 мая 1934 г.

Дзяржплану і НКЗ Бел. забяспечыць будаўніцтва ўне чаргі неабходнымі матэрыяламі. СНК БССР уключыць Геафізічную абсерваторыю ў аб'ект ударнага будаўніцтва.

8. Для разгортвання работы Геафізічнай Абсерваторыі даручыць Галоўнаму Кіраўніцтву АГМС запрасіць на сталую працу з цэнтральных навукова-даследчых установ 2-3 чал. высока-кваліфікаваных спецыялістаў.

Абавязаць Менскі Гарсавет забяспечыць уне чаргі запрошаных спецыялістаў неабходнымі кватэрамі.

9. Даручыць ЦК ЛКСМБ у дэкадны тэрмін вылучыць у якасці назіральнікаў вода-дажджа-снегамерных пастоў на станцыі III разрада ў ліку 175 асоб членаў КСМ—лепшых ударнікаў калгаснікаў, рабочых совгасаў і МТС без адрыва ад вытворчасці.

ЗАГАД № 524/168

па Цэнтральнаму Кіраўніцтву адзінай Гідраметслужбы СССР

15 снежня 1933 г.

§ 1

Выходзячы з пастановы ЦК КП(б)Б ад 15-XI-33 г. аб рабоце Галоўнага Кіраўніцтва АГМС БССР і лічачы неабходным тэрмінова ліквідаваць вынікі шкодніцтва, паказанага ў пастанове і меўшага месца ў рабоце органаў АГМС БССР, і забяспечыць апошнія ад магчымасці праяўлення шкодніцкіх актаў у рабоце АГМС у далейшым, а таксама ўлічваючы неабходнасць арганізацыйнага ўмацавання АГМС БССР — ЗАГАДВАЮ:

1. Нач. ГК АГМС БССР т. Мамаеву забяспечыць выкананне ўскладзеных на яго пастановай ЦК КП(б)Б даручэнняў, прычым пры выкананні даручэння па праверцы ўсяго склада работнікаў гідраметслужбы і па поўнаму ачышчэнню асабовага склада апошняй ад класава-чуждага элемента, звярнуць асаблівую ўвагу на тэрміновасць выканання, на „ограждение" службы пасля ачышчэння яе ад пранікання ў яе класава-чуждага элемента, на падвышэнне ўзроўня тэхнічных ведаў партыйнага і комсамольскага склада і на правільнае размеркаванне палітычна-вытрыманых кадраў па сеці органаў АГМС БССР для належнага кіраўніцтва ўсёй сеткай.

2. Для хутчэйшага скарыстання імпартнага абсталявання Менскай абсерваторыяй:

а) планава-фінсектару пад адказнасць т. Міліцына ўзбудзіць хадайніцтва перад адпаведнымі арганізацыямі аб уключэнні будаўніцтва беларускай абсерваторыі і стандартнага дома для навуковых работнікаў у аб'екты ўдарнага будаўніцтва;

б) будаўніцтва беларускай абсерваторыі лічыць у сістэме Цэнтральнага Кіраўніцтва АГМС СССР ударнай будоўляй, для чаго планава-фінансаваму сектару выдзеліць неабходныя сродкі для сканчэння будаўніцтва абсерваторыі і стандартнага дома для навуковых работнікаў;

в) сектару снабжэння пад адказнасць т. Леонцева ўне чаргі выдзяляць неабходныя фонды і нарады на будматар'ялы, а таксама ўзбудзіць хадайніцтва перад адпаведнымі арганізацыямі аб выдзяленні ў першую чаргу, не пазней першых дзён першага квартала 1934 г., нарада на два вагоны цэмента з тым, каб магчыма было працягваць кладку ў зімовы час;

г) т. Мамаеву забяспечыць кіраўніцтва будаўніцтвам з такім разлікам, каб скончыць будаўніцтва абсерваторыі к 1 мая 1934 г., а дом для навуковых работнікаў к 1 кастрычніка 1934 г.;

д) для ўмацавання кадрамі абсерваторыі даручыць т. Белову падабраць двух кваліфікаваных спецыялістаў на сталую работу ў БССР па спецыяльнасцям: акцінометрыі, атмасфернай электрычнасці і метеаралогіі. Тэрмін—не пазней канца першага квартала 1934 года;

е) т. Мамаеву накіраваць у ЦБН 2-3 асоб для падрыхтоўкі іх у якасці сіноптыкаў. Дырэктару ЦБН тав. Кох забяспечыць своечасовую і належную падрыхтоўку камандыраваных таварышоў з БССР;

ж) сектару кадраў і планава-фін. сектару прадугледзець неабходныя сродкі па бюджэту 1934 г. на падрыхтоўку праз курсы сярэдняй і вышэйшай кваліфікацыі кадраў неабходных работнікаў Кіраўніцтва і Інстытута БССР, а таксама асігнаваць неабходныя сродкі на падрыхтоўку трох аспірантаў у цэнтральных навукова-даследчых інстытутах;

з) Гідраметснабу выдзеліць неабходнае абсталяванне для абсерваторыі і сеці станцый БССР, а таксама прыняць неабходныя заказы на вытварэнне прыбораў;

і) т. Леонцеву ўзбудзіць хадайніцтва перад адпаведнымі арганізацыямі аб выдзяленні нарада для Гал. Кіраўніцтва АГМС БССР на грузавую 1½—2-тонную аўтамашыны, а таксама зрабіць заказ у адпаведных заводах на вытварэнне такарнага станка і неабходнага абсталявання для зараднай станцыі (альбо ртутнага выпраміцеля);

к) т. Белову паставіць пытанне перад учраспрэдам ЦК УсеКП(б) аб адкамандыраванні ў распараджэнне Гал. Кіраўніцтва АГМС БССР на сталую навукова-даследчую работу т. Юневіча (згодна пастановы ЦК КП(б)Б);

л) т. Мамаеву забяспечыць неадкладнае скарыстанне тых прылад, якія могуць быць пушчаны ў работу часова да пабудовы абсерваторыі, а таксама скончыць распачатае мерапрыемства, згодна пастановы ЦК КП(б)Б аб умацаванні работнікаў перыферыі членамі ЛКСМ да 1 студзеня 1934 г.

§ 2

Для праверкі прагнозаў, якія даваліся па БССР, як гідралагічных, так і сінаптычных, для ўстанаўлення прычын неправідлозасці прагнозаў, у прыватнасці, прагноза летняга павадка 1933 г. і веснавой паводкі 1931 г. дырэктару ЦБН тав. Кох арганізаваць брыгаду з кампетэнтных асоб і паслаць яе ў БССР да 15 студзеня 1934 г.

Такую-ж праверку правесці на Украіне, у прыватнасці для ўстанаўлення прычын неправідловых прагнозаў і даведак у адносінах узроўня вод з пасылкай брыгады да 15 студзеня 1934 г.

§ 3

Разам з тым, улічваючы, што выяўленыя ў АГМС БССР віды шкодніцтва—затрымка ў будаўніцтве на працягу 4 год будынку абсерваторыі, неправідловыя назіранні на станцыях, невыкананне плана, засмечанасць класава-чуждым элементам адказных назіральных станцый—могуць мець месца і маюць месца і ў другіх рэспубліках, краях і вобласцях, ЗАГАДВАЮ:

Начальнікам усіх кіраўніцтваў АГМС неадкладна ўважліва перагледзець увесь склад работнікаў службы ў адпаведнасці з данымі раней паказаннямі Цэнтральнага Кіраўніцтва ў мэтах ачышчэння склада ад класава-варожых элементаў, узмацніць непасрэдную праверку работы і выканання планаў усіх органаў АГМС на мясцах, дамагаючыся рэгулярнага інспектыравання ўсіх станцый рэспублікі, края і вобласці, а таксама мабілізаваць увагу работнікаў АГМС на хутчэйшае выяўленне ўсіх недахопаў у рабоце і іх неадкладную ліквідацыю.

Начальнік Цэнтральнага Кіраўніцтва
АГМС СССР *Вангенгейм.*

Сінаптычны агляд.

У першыя 3 дні гэтай дэкады тэрыторыя Беларусі знаходзілася пад уплывам антыцыклона, які складаўся з халодных мас кантынентальнага арктычнага паветра, дзякуючы чаму ў гэтыя дні па БССР наглядалася яснае без значных ападкаў надвор'е з тэмпературамі, даходзячымі да —15—19° ноччу і да —6—10° удзень.

4 снежня наглядаецца пацяпленне і павелічэнне воблачнасці да поўнай, дзякуючы таму, што антыцыклон пачаў рухацца на паўднёвы захад пад націскам больш цёплых мас морскага палярнага паветра, якія знаходзіліся на Скандынавіі і рухаючыся ў паўднёва-ўсходнім напрамку распаўсюджваліся на Фінляндыю, Ленінградскую вобласць і паўночную частку Беларусі.

5 і 6 снежня тэрыторыя БССР ужо цалкам занята цёплымі масамі марскога палярнага паветра, што выклікала падвышэнне т-ры да —2 і 0° ноччу і да +1 +2 градусаў удзень і невялікі снег.

7 снежня масы марскога палярнага паветра адыходзяць на поўдзень і тэрыторыя Беларусі займаецца масамі халоднага

арктычнага паветра, што выклікае паніжэнне т-ры да —7 —14°, а 8 снежня т-ры ўжо зніжаюцца да —20 —25° на поўначы краіны і да —12 —18 на поўдні краіны, з захоўваннем пахмурнага з невялікімі снегападамі надвор'я.

9 і 10 снежня тэрыторыя БССР знаходзіцца пад уплывам вобласці паніжанага ціску—лагчыны, якая складалася з мас марскога арктычнага паветра, што выклікае ў БССР невялікае падвышэнне т-ры, якая 10 снежня даходзіць да —7 —14° пры значнай зменнай воблачнасці і невялікіх снегападах. На поўначы краіны 10 снежня наглядаліся туманы, якія ўтварыліся ў выніку замяшчэння арктычнага паветра больш цёплым марскім арктычным паветрам.

Наогул гэта дэкада характэрна значным ваганнем т-ры і выпадзеннем снега на працягу 7 дзён дэкады.

Я. Івашчэнка.

Метэаралагічная характарыстыка за 1—10 снежня 1933 г.

Тэмпература паветра ў гэту дэкаду хісталася надзвычайна рэзка. У першыя дні тэмпература трымаецца вельмі нізкая, асабліва 2-га, калі яна дасягнула —16° на паўночным усходзе і —13° на паўднёвым захадзе. Потым тэмпература значна падвышаецца і 5-га і 6-га дасягае 0°. Пасля гэтага ўздыму т-ра зноў рэзка зніжаецца і 8-га маем —15 —20°, толькі на крайнім паўднёвым захадзе БССР т-ра апусцілася да —11° (Лельчыцы). У апошнія дні т-ра некалькі павысілася.

Сярэдняя дэкадная т-ра хісталася ад —7° да —9° і, такім чынам, была на 4-5° ніжэй нармальнай. Максімальная т-ра роўна 1-2°. Мінімальная т-ра па ўсёй БССР хісталася ад —18 да —23° і толькі ў паўднёвай зоне каля —16°.

Ападкі выпалі ў невялікай колькасці асабліва на захадзе і поўдні БССР. Сутачныя колькасці не перавышалі 5 мм, а ў большасці выпадкаў хісталіся каля 1 мм. За дэкаду выпала ападкаў ад 1 да 10 мм.

К канцу дэкады ўтварыўся снегавы насціл, да 10 см вышынёю па ўсёй БССР, за выключэннем паўночнай зоны, дзе ён хістаўся ад 10 да 20 см. У большасці няроўнамерны.

Вятры пераважалі паўночна-заходнія і заходнія з вельмі значнымі хуткасцямі, якія дасягалі 15—20 м/сек.

Н. Малішэўская.

Сельска-гаспадарчая гідраметэаралагічная характарыстыка за дэкаду

Умовы надвор'я першай дэкады снежня ў сэнсе ходу тэмпературы паветра былі ў БССР не зусім спрыяючымі для азімых культур і садоў.

Меўшыя месца ў паасобныя дні рэзкія хістанні сярэдніх сутачных тэмператур ад —16° да 0 на паўночным усходзе і —13°

Табліца вынікаў метеаралагічных

Раён	№№ па карце	Назва станцый	Тэмпература паветра 1	2	3	4	5	6	7	8	9	10		Сярэдняя	Нармальн.	Максімальная	Мінімальная	Чысло, калі наглядаўся мінімум
(Вазерны)	2	Дрыса[1])	—7	—16	—12	—1	1	—2	—11	—14	—7	—6	—	—8	—	2	—22	8
	3	Полацак[2])	—7	—14	—12	—2	0	—2	—11	—16	—6	—8	—	—8	—4	2	—23	8
	68	Гаралок	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова Каралёва[3])	—8	—16	—10	—3	—1	—4	—12	—18	—8	—9	—	—9	—4	1	—23	8
(Вадападзельны)	8	Лепель[4])	—7	—14	—11	—2	0	—2	—9	—16	—6	—8	—	—8	—	0	—22	8
	75	Плешчаніцы[5])	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў	—7	—13	—10	—3	1	—1	—8	—16	—6	—9	—	—7	—3	1	—16	8
	16	Менск[6])	—6	—12	—12	—4	—1	0	—8	—16	—8	—8	—	—7	—3	2	—21	8
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка[7])	—7	—12	—11	—4	—1	0	—8	—15	—6	—10	—	—7	—3	1	—20	8
	25	Асіпавічы[8])	—8	—12	—11	—4	—1	0	—5	—14	—6	—7	—	—7	—4	2	—18	8
	10	Орша[9])	—7	—14	—10	—2	0	—2	—9	—19	—6	—10	—	—8	—4	1	—26	8
	19	Горкі[10])	—7	—16	—10	—3	0	—4	—9	—20	—7	—11	—	—9	—4	1	—27	8
(Раўнінны)	89	Клічаў[11])	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцак[12])	—6	—11	—11	—5	—2	1	—7	—15	—6	—10	—	7	—	1	—18	8
	30	Мар.-Сосны	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—7	—2	1	—23	7
	21	Магілеў[13])	—7	—14	—10	—3	—1	—2	—9	—20	—7	—11	—	—8	—4	1	—23	8
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў[14])	—8	—15	—9	—3	—1	—2	—10	—20	—8	—12	—	—9	—4	1	—22	8
	191	Касцюковічы[15])	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск	—8	—13	—9	—4	—2	0	—8	—15	—8	—12	—	—8	—3	1	—18	8
	32	Жлобін[16])	—7	—12	—10	—4	—2	0	—8	—15	—8	—11	—	—8	—3	2	—17	8
(Нізінны)	33	Жыткавічы[17])	—7	—11	—11	—7	—4	0	—6	—12	—8	—8	—	—7	—2	1	—16	3
	37	Калінкавічы[18])	—6	[illegible]	—11	—6	—4	0	—8	—12	—9	—7	—	—7	—3	1	—16	3
	39	Лельчыцы[19])	—7	[illegible]	—11	—7	—4	0	—4	—11	—10	—7	—	—7	—	1	—16	3
	85	Чачэрск[20])	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	83	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	38	Гомель	—7	[illegible]	—10	—4	—2	0	—8	—16	—9	—8	—	—8	—3	1	—17	8
	35	Васілевічы[21])	—6	—12	—10	—5	—3	0	—7	—13	—9	—7	—	—7	—3	1	—16	3
	40	Людвінава	—6	—11	—10	—5	—3	0	—6	—10	—9	—8	—	—7	—2	1	—15	3

[1]) мяцель (8); [2]) мяцель (4, 8); [3]) мяцель (3, 4); [4]) мяцель (7, 8); [5]) мяцель (10); [6]) мяцель (5, 9),
…ура (2, 4), мяцель (6, 10); [13]) мяцель (3, 4), туман (7, 10); [14]) мяцель (3); [15]) мяцель (3); [16]) мяцель (5,9);

назіранняў за 1—10 снежня 1933 г.

Адносная вільготн. паветра за 13 г. у %	Тэмпература паверхні глебы: Максім.	Мінімальн.	Чысло, калі наглядаўся мінімум	Ападкі ў мм: 1	2	3	4	5	6	7	8	9	10		Сума	Снегавы насціл: Вышыня ў см	Шчыльнасць	Характарыстыка снегавага насцілу
79	—	—	—	0.5	..	..	3.0	1.0	1.0	0.5	1.0	..	..	—	7.0	10	0.22	роўнамерн
86	—	—	—	0.2	..	.	5.0	2.0	0.6	0.4	4.0	..	..	—	12.2	14	0.25	роўнамерн
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	0.5	.	0.1	1.0	1.0	1.0	1.0	..	..	1.0	—	5.6	16	—	роўнамерн
80	1	—26	8	0.2	..	0.6	4.0	0.6	0.1	3.0	1.0	..	1.0	—	10.5	21	0.23	роўнамерн
—	—	—	—	0.1	..	..	2.0	2.0	2.0	0.3	1.0	0.1	0.4	—	7.9	10	0.28	няроўнамер
—	—	—	—	0.2	..	..	5.0	1.0	2.0	..	2.0	0.3	0.3	—	10.8	10	—	—
—	—	—	—	0.1	0.1	0.2	0.6	3.0	1.0	0.4	1.0	3.0	0.1	—	9.5	9	—	няроўнамер
85	—	—	—	0.1	..	.	4.0	1.0	2.0	2.0	1.0	1.0	..	—	11.1	7	0.10	роўнамерн
84	1	—20	8	0.2	..	..	3.0	3.0	1.0	0.3	1.0	0.2	0.2	—	9.1	8	0.8	няроўнамер
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
80	0	—20	8	0.1	..	..	0.5	0.3	1.0	0.1	0.3	0.2	0.1	—	2.6	5	0.17	няроўнамер
80	—	—	—	..	..	..	..	..	1.0	1.0	..	..	..	—	2.0	3	0.3	няроўнамер
84	—	—25	8	9.3	..	0.1	1.0	1.0	2.0	0.5	..	0.3	1.0	—	6.2	10	0.15	роўнамерн
86	1	—17	3	0.1	..	.	1.0	1.0	2.0	0.6	1.0	0.4	0.6	—	6.7	10	0.20	няроўнамер
—	—	—	—	0.1	0.1	..	..	1.0	1.0	0.5	0.3	0.4	0.2	—	3.6	1	—	няроўнамер
82	—	—16	8	..	..	.	0.2	0.6	2.0	0.2	0.4	0.1	..	—	3.5	5	—	сумёты
84	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
82	—	—	—	..	..	0.3	4.0	2.0	2.0	0.3	0.3	1.0	0.1	—	10.0	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
85	—	—	—	1.0	..	0.2	1.0	1.0	1.0	0.3	1.0	0.1	0.1	—	5.7	3	—	няроўнамер
—	—	—	—	0.3	..	0.4	2.0	1.0	2.0	0.1	1.0	0.1	0.1	—	7.0	5	—	няроўнамер
81	1	—23	10	..	..	..	0.3	0.2	1.0	..	..	1.0	..	—	2.5	5	0.10	роўнамерн
70	—	—	—	..	..	..	0.6	1.0	0.4	0.1	0.5	1.0	..	—	3.6	4	—	роўнамерн
74	—	—16	4	0.3	..	..	0.2	0.3	1.0	0.1	0.1	0.1	..	—	2.1	5	0.15	роўнамерн
79	—	—	—	..	..	..	0.1	1.0	1.0	0.1	0.2	0.3	0.8	—	3.5	6	0.10	роўнамерн
77	—	—	—	..	0.1	..	..	0.1	1.0	1.0	0.1	0.2	..	—	2.5	3	—	няроўнамер
—	—	—	—	0.1	..	..	1.0	1.0	2.0	0.1	1.0	1.0	..	—	—	3	—	няроўнамер
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	..	..	..	1.0	0.5	1.0	0.1	1.0	2.0	0.1	—	5.7	3	—	роўнамерн
71	—	—16	3	..	..	..	0.2	1.0	2.0	0.1	0.3	0.1	..	—	8.7	2	—	няроўнамер
67	0	—16	3	..	..	..	..	0.2	0.3	0.3	0.2	0.5	0.1	—	1.6	—	—	—

туман (1. 10); [7]) мяцель (3, 5); [8]) туман(1), мяцель (5); [9]) мяцель (3); [10]) бура (3, 4); [11]) мяцель
[17]) галалёд (6, 7); [18]) бура (1); [19]) мяцель (5); [20]) мяцель (4, 5); [21]) бура (10), галалёд (5).

Табліца вынікаў метэаралаг. назіранняў за 1—10 снежня 1933 г.

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Вецер: Пераважаючы: Напрамак	Вецер: Пераважаючы: Хуткасць	Вецер: З максім. хуткасцю: Напрамак	Вецер: З максім. хуткасцю: Хуткасць	Інсаляцыя ў %%	Сярэдняя воблачнасць у 10-балавай сістэме: Агульная	Сярэдняя воблачнасць у 10-балавай сістэме: Ніжняя	Сярэдні стан паверхоўага пласта глебы (на глыб. 10—15 см)
I. Паўночны (Вазёрны)	2	Дрыса	—	—	—	—	—	8	8	замерзшая
	3	Полацак	N	4	NW	10	—	8	8	„
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	замерзшая
	7	Нова-Каралёва	NW	4	NW	12	12	8	8	„
II. Пераходны (Вадападзельны)	8	Лепель	W	6	E	12	—	8	8	замерзшая
	75	Плешчаніцы	—	—	—		—	—	—	„
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	„
	13	Барысаў	NW	4	W	7	—	8	8	замерзшая
	16	Менск	NW	4	NE	10	—	8	8	„
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка	W	6	N	12	—	8	8	замерзшая
	25	Асіпавічы	NW	6	NW	12	—	8	8	„
	10	Орша	NW	4	NW	10	—	8	8	„
	19	Горкі	NW	6	NW	18	—	8	6	„
III. Цэнтральны (Раўнінны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	замерзшая
	28	Слуцак	W	6	W	15	—	8	8	—
	30	Мар'іна-Сосны	—	—	—	—	—	8	—	—
	21	Магілеў	N	4	W	10	—	8	6	замерзшая
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	W	6	NW	15	—	8	8	замерзшая
	191	Касцюковічы	—	—	—		—	—	—	„
	31	Турск	W	4	W	7	—	8	8	„
	32	Жлобін	W	6	NW	15	—	8	6	—
IV. Паўднёвы (Нізінны)	33	Жыткавічы	W	4	W	7	—	8	6	замерзшая
	37	Калінкавічы	W	4	NE	15	—	8	8	„
	39	Лельчыцы	SW	4	SW	10	—	10	9	—
	85	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	замерзшая
	83	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—
	38	Гомель	W	4	W	15	—	8	6	замерзшая
	35	Васілевічы	NW	6	NW	15	25	8	8	„
	40	Людвінава	W	9	W	10	—	10	9	„

да 0 на паўднёвым захадзе, а пасля зноў моцныя зніжэнні да —15, —20⁰ (мінімальныя тэмпературы паветра ў паасобных раёнах даходзілі да —22⁰, —27⁰), пры слабым снегавым насціле, які ўтварыўся толькі ў канцы дэкады, тэмпературы паверхні глебы роўнай у сярэднім —20⁰ (мінімальныя тэмпературы паверхні глебы ў паасобных раёнах даходзілі ад —16⁰ да —26⁰), маглі шкодна адбіцца на становішчы азімых культур. Асабліва маглі пашкодзіцца азімыя позніх тэрмінаў пасева—з дрэнным кушчэннем, а таксама азімая пшаніца.

15/XII-33 г.

Орман.

Адказны рэдактар *П. Мамаеў*

Тэхнічны рэдактар *П. Дудкін.*

Члены рэдкалегіі *А. Кайгарадаў*, *П. Бугаеў*

Друкарня БелАН. Гарліт № 2571. Заказ № 4692. Тыраж 1000 экз. ½ арк.

Москва 35 Ленинский
12.1.34

…ае Кіраўніцтва
Гідраметэоролёгічнай Службы
Б. С. С. Р
Менск, Шырокая 28

БЕСПЛАТНО
Соглас. … „ЦК“ … Менск. … от 18-VII-30 г. № 18%

2111

Менск БССР
11.1.34

Москва
Софийская Набережная № 3
Гидрометеоролог. станции
ЦБК